# Тры пытанні да чытача

## Галіна АЛЕЙНІК, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:

**«ВАША ГАЗЕТА ЗАЙМАЕ Ў МАІМ ЖЫЦЦІ НЕ АПОШНЯЕ МЕСЦА»**

**1. Чаму вы чытаеце «Звязду»?**

*— Вы ж разумееце, што ўжо сама праца ў бібліятэцы, тым больш Нацыянальнай, абавязвае мяне кожны дзень праглядваць «акіян» прэсы. Не ўсю, вядома, аднак, шчыра скажу, ваша газета займае ў маім жыцці не апошняе месца.*

**2. Што вам падабаецца ў «Звяздзе»?**

*— Перш за ўсё ваша газета ў мяне асацыіруецца з аб'ектыўнай палітычнай і эканамічнай інфармацыяй. І, што галоўнае, інфармацыяй двухбаковай — без крайнасцяў, але карыснай.*

**3. Што б вы хацелі змяніць у «Звяздзе»?**

*— Каб вы больш пісалі аб культуры. У гэтым сэнсе я не магу роўніць вашу газету з тымі ж, скажам, «Кніжным аглядам» (дарэчы, а чаму б вам не ўвесці такую рубрыку?) альбо ЛіМам. Таму і аддаю перавагу апошнім.*